www.sakavik.net

# Рэлігія ў розныя перыяды развіцця краіны

## Паганства – Праваслаўе – Двухвер'е (гібрыд паганства і праваслаўя) – Каталіцызм – Юдаізм – Пратэстантызм – Іслам – Уніяцтва – Атэізм

| Перыяд развіцця краіны | Характарыстыка рэлігійных веравызнанняў |
|---|---|
|  960 – 1397 Полацкае княства | **Паганства.** Бог Пярун, Даж-бог (бог урадлівага сонца), Ярыла, Велес, Купала - бог дастатку і ўраджаю; Вярба - багіня вясны, хатнія духі - <u>дамавік</u>, <u>лазнік</u>, хлеўнік, духі прыроды - <u>лесавік</u>, <u>палявік</u>. **Праваслаўе ўсталявалася ў асноўным у 13 ст. Існавала двухвер'е (гібрыд паганства і праваслаўя).** |
|  1236 – 1569 Вялікае Княства Літоўскае (ВКЛ) | **Праваслаўе. Паганства. Каталіцызм (з 1387 г.). Юдаізм.** Першы кароль Літвы Міндоўг перайшоў з паганства ў праваслаўе, а затым у каталіцызм пры каранаванні ў 1252 г. Князь Вітаўт (1350-1430), пад уплывам дзяржаўных інтарэсаў, хрысціўся тройчы (1382 – каталік, 1384 – праваслаўны, 1386 – каталік). Юдэі прыйшлі ў Беларусь у 14-15 ст.ст. |
|  1569 – 1798 Рэч Паспалітая | **Уніяцтва (з 1596 г.). Каталіцызм. Пратэстантызм. Праваслаўе. Юдаізм. Іслам.** У 1569 г. ў сенаце ВКЛ было толькі двое непратэстантаў. Пратэстантамі былі магнаты Валовічы, Глябовічы, Сапегі, Агінскія, Хадкевічы, Вішнявецкія. З 1658 г. пратэстанты пачалі выціскацца з Рэчы Паспалітай. У 1596г. была абвешчана <u>Брэсцкая царкоўная унія</u> - Праваслаўная царква пераходзіла пад пратэктарат Папы Рымскага з захаваннем абраднасці набажэнства (уніяцтва). У канцы 16ст. ў Беларусі з'явіліся першыя пасяленцы татары. У канцы 18 ст. звыш 75% насельніцтва наведвала уніяцкія цэркви і 6,5% - праваслаўныя цэрквы; большасць шляхты-магнатаў была каталікамі. |
|  1798 – 1917 без дзяржаўнасці *(пад Расійскай імперыяй)* | **Праваслаўе. Каталіцызм. Юдаізм. Іслам.** Пасля паўстання 1830 года уніяцтва на тэрыторыі Беларусі было ліквідавана, а большая частка уніятаў вымушана была перайсці ў праваслаўе. |
|   1917 – 1990 БНР, БССР | **Атэізм.** У <u>Заходняй Беларусі</u> - палітыка акаталічвання, ва Усходняй - храмы разбураліся, святарства вынішчалася. Царква разглядалася як класавы вораг. Пасля 1939 г. прыцясненне царквы праводзілася і на захадзе Беларусі. У 1985 г. у БССР засталося толькі 369 праваслаўных цэркваў (637 былі зачынены). |
|   з 1990 сучасны этап | **Праваслаўе. Атэізм. Каталіцызм. Пратэстантызм.** У краіне цяпер налічваецца 27 веравызнанняў (канфесій ці іх напрамкаў). Праваслаўе ахоплівае 48.3% насельніцтва. 41.1% насельніцтва складаюць няверникі. |